Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

9 ЛІПЕНЯ 2019 г. АЎТОРАК № 126 (28993)



АДУКАЦЫЯ Ў ЕЎРАЗІЙСКІМ САЮЗЕ

ЗАВАЁЎНІК З ДУШОЙ ГЕРОЯ

ЦЫТАТА ДНЯ

Анатоль КОТАЎ, намеснік дырэктара фонду «Дырэкцыя II Еўрапейскіх гульняў 2019 года»:

«Пасля правядзення II Еўрапейскіх гульняў Беларусь можа прыняць спаборніцтвы самага высокага ўзроўню па многіх відах спорту. Цяпер наша краіна, упэўнены, можа сама выбіраць, якія спартыўныя турніры праводзіць. Прадстаўнікі міжнародных федэрацый убачылі нашу базу і магчымасці па правядзенні буйных міжнародных стартаў. Наколькі мне вядома, асобныя федэрацыі ўжо цікавяцца магчымасцю арганізацыі буйных спаборніцтваў. Адна з умоў арганізацыі мультыспартыўнага форуму — правядзенне турніраў на новым абсталяванні, якое цяпер ёсць на кожным са спартаб'ектаў Гульняў».

КОРАТКА

- **Беларусы ў першым паўгоддзі прадалі валюты на $322 млн больш, чым купілі.**
- Дзяржстандарт выявіў недаліў у бутэльках 38 з 47 партый сланечнікавага алею. Прычым недаліў алею ў некаторых бутэльках склаў ад 27 да 52 мл у залежнасці ад аб'ёму.

- **Міхаіл Грабоўскі прызначаны спартыўным дырэктарам ХК «Дынама-Мінск».**
- Першага намесніка дырэктара УП «Спецкамбінат КБА» затрымалі за хабар. Па звестках праваахоўнікаў, затрыманне звязана з незаконным прадастаўленнем месцаў для пахаванняў на могілках «Паўночныя».

ISSN 1990 - 763X

КУПАЛЬСКІЯ ФАРБЫ АЛЕКСАНДРЫІ

Свята «Александрыя збірае сяброў» наведалі больш за 65 тысяч чалавек

Фота БелТА.

За дзесяць гадоў існавання рэспубліканскае свята «Александрыя збірае сяброў» стала яркім сімвалам братэрскай дружбы народаў Беларусі, Расіі і Украіны. Гэта адзначыў Прэзідэнт перад пачаткам гала-канцэрта ў Александрыі.

Аляксандр Лукашэнка згадаў, што першы форум быў маленькі і сціплы, як кавалак зямлі, на якім праводзіўся. Але ўжо тады прыгожы ў сваёй самабытнасці — і, як паказаў час, перспектыўны. Фестываль хутка перасягнуў статус рэгіянальнага, сёння зоркі эстрады прыязджаюць у Александрыю з вялікім задавальненнем.

Кіраўнік краіны ўпэўнены: такая незвычайная зацікаўленасць узнікла таму, што на гэтай гасціннай зямлі асабліва праяўляецца феномен сілы прыцягнення малой радзімы і ўсходнеславянскай роднасці. Тры нацыі пераплеценыя гістарычнымі, роднаснымі, духоўнымі каранямі, нібы тры магутныя дубы на беразе паўнаводнага і шчодрага Дняпра.

«Вытокі гэтай вялікай ракі пачынаюцца ў Расіі, потым яна нясе свае воды па Беларусі і завяршае шлях ва Украіне — быццам крывяноснай сістэмай звязвае нас наймацнейшымі вузамі добрасуседства, даверу і адкрытасці», — прывёў аналогію Прэзідэнт.

СТАР. 2

На парадку дня

БУДЗЕМ І З БУЛЬБАЙ, І З ЗЕРНЕМ, І З... КАВУНАМІ

Нягледзячы на неспрыяльнае надвор'е, ураджай чакаецца нядрэнны

Сёлета ў Беларусі плануюць сабраць 7,6 мільёна тон збожжа. Нягледзячы на тое, што вясной і ў пачатку лета склалася неспрыяльнае для пасеваў надвор'е, аграрыі зрабілі ўсё магчымае, каб страты не адбіліся на ўраджаі. Акрамя гэтага, у сельскагаспадарчых арганізацыях і фермерскіх гаспадарках будзе вырашчана звыш 1 мільёна тон бульбы, 560 тысяч тон гародніны і 150 тысяч тон пладова-ягаднай прадукцыі.

— Дэфіцыт ападкаў у спалучэнні з павышаным тэмпературным рэжымам выклікаў інтэнсіўную страту вільгаці ў глебе, асабліва на поўдні краіны. А ў трэцяй дэкадзе чэрвеня пачаліся ліўні са шквалістым ветрам. Гэта прывяло да частковага палягання і пашкоджання пасеваў у шэрагу рэгіёнаў краіны, — расказала **намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення раслінаводства Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Таццяна КАРБАНОВІЧ.**

СТАР. 13